№ 16 (60)

# ПАХОДНЯ

ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА Лістапад 2007 г.

## Эканомяць на здароўі дзяцей

14 лістапада ў Машчаніцкай школе Бялыніцкага раёна адбыўся бацькоўскі сход, на якім былі падведзены вынікі навучальнага працэсу ў першай чвэрці гэтага навучальнага года. Але не на гэтым я хацеў бы засцярожыць вашу ўвагу, шаноўныя чытачы. Асноўную частку свайго выступу малады дырэктар школы Андрэй Аляксандравіч Ганчук прысвяціў асвятленню пытання выканання Дырэктывы № 3 кіраўніка краіны аб эканоміі і беражлівасці. Дзеля змяншэння расходу электраэнергіі ва ўсіх класных памяшканнях адключылі лямпачкі на апошніх радах, бо вучняў ва ўсіх класах вясковай школы засталося няшмат. Таксама не паляць святло ў калідорах школы падчас урокаў і пераменаў, калі вучні могуць яшчэ што-небудзь бачыць так. Такі загад РАНА і калі школа дапусціць перавышэнне ліміту спажывання электраэнергіі, то гэта перавышэнне будзе аплочваць дырэктар са сваёй кішэні. Зараз тэмпература паветра ў памяшканні школы не перавышае 15 градусаў па Цэльсію і Андрэй Аляксандравіч лічыць гэта дасягненнем, бо ў памяшканні Старасельскай школы тэмпература паветра не падымаецца вышэй за 11-13 градусаў. І як дырэктар гэты малады хлопец нічога зрабіць не можа, бо школьную кацельню перадалі жылкамунгасу, а той, таксама ў мэтах эканоміі, падае ў школу гарачую ваду на ацяпленне тэмпературай 36 градусаў замест мінімальна дапушчальных 46.

Акрамя гэтага, дадаў Андрэй Аляксандравіч, банк перапыніў фінансаванне далейшага рамонту школы па невядомых прычынах і таму другі паверх школы застанецца са старымі вокнамі і дзвярамі, будзе скончаны рамонт толькі на трэццім паверсе.

Трэба сказаць, малады дырэктар яшчэ крыху прылагодзіў сітуацыю. Асабіста я бачыў, што ў памяшканні, дзе займаюцца вучні першага і трэццяга класаў, тэрмометр паказваў 12 градусаў па Цэльсію. І, як сказала настаўніца гэтых класаў Жыгера Наталля Аляксандраўна, тэрмометр не падымаецца вышэй за гэтай адзнакі ўжо больш за тыдзень. Маленькія дзеці хварэюць, кашляюць, аб якой вучобе можа ісці размова. Амаль кожны дзень ў школе бывае процьма правяраючых, пастаянны госць намеснік старшыні выканкама па ідэалогіі Надзея Сяргееўна Серыкава, а на просьбу дапамагчы не губіць здароўе дзяцей усе толькі разводзяць рукамі – трэба выконваць дырэктыву...Жах.

Я абтэлефанаваў шэраг вясковых школ і дзіцячых садкоў Бялыніцкага раёна і амаль паўсюдна сітуацыя такая самая, як у школе аграгарадка Машчаніца. Хочацца запытаць у нашай арміі чыноўнікаў – вы што, і найдалей збіраецеся эканоміць на здароўі дзяцей?

Калі нехапае сродкаў, дык можа крыху прарэдзьдзе свае шчыльныя рады, бо насельніцтва раёна за апошнія гады зменшылася на пяць тысяч чалавек, а колькасць бюракратаў толькі значна вырасла. РАНА займае памяшканне былога райкама партыі і месца ледзь хапае, а калі дабавіць сюды іншыя аддзелы райвыканкама...А з'эканомленыя грошы аддайце дзецям, каб яны маглі вучыцца ў нармальных умовах і расці здаровымі людзьмі.

***Барыс Вырвіч***

## Пра «чэсныя» газеты

Процент списания государственных печатных изданий, поступивших в торговую сеть УП «Гомельоблсоюзпечать» (за январь-май 2007 г. процент списания составил: **<u>«Советская Белоруссия»</u> -29,6%, <u>«Рэспубліка»</u> - 20,2%, «Гомельская праўда» 23,8%, «Гомельские ведомости» (городская газета) 32,6%, «Дняпровец» (Речицкая районная) -20,2%). В Могилевской области за этот же период процент списания от количества посыла в розничную торговлю составил: <u>«Советская Белоруссия»</u> - 44,9%;<u>»Рэспубліка»</u> - 36,2%;»Народная газета» - 17,5%; «Могилевские ведомости» - 51,4 %;»Могилевская правда» - 38,7%; «Земля и люди» - 47% В Витебской области процент списания государственных республиканских и областных печатных СМИ от количества поступивших в розничную продажу в первом полугодии 2007 г. составил: <u>«Советская Белоруссия»</u> - 29,3%; <u>«Рэспубліка»</u> - 25,9%; «Віцебскі рабочы» 33,7%; «Народнае слова» - 39,8%».**

# Прэзентацыя новай кнігі Рыгора Кастусёва і Пятра Мігурскага

У нядзелю 11 лістапада ў Шклове адбылася прэзентацыя новай кнігі Рыгора Кастусёва і Пятра Мігурскага “Шклоўскі раён. Стратэгія развіцця”. У кнізе аўтары прааналізавалі сітуацыю сацыяльна – эканамічнага стану Шклоўскага раёну і выклалі сваё бачанне стратэгіі далейшага развіцця суседняга з Бялыніччынай рэгіёну. Гэта кніга з’яўляецца ўжо другой выдадзенай творчым тандэмам вышэй згаданых аўтараў і яна як бы працягвае першую кнігу “Шклоўскі раён. З мінулага ў будучыню”. Удзел у мерапрыемстве прыняло больш за дваццаць чалавек.

“Мы напісалі ў кнізе пра стратэгічнае развіццё рэгіёну з пункта гледжання дэмакратычных лідэраў – адзначыў у сваім выступе Рыгор Кастусёў. – Быў зроблены глыбокі аналіз сітуацыі ў рэгіёне. І зараз мы прапануем сваё бачанне яго развіцця. Мы напісалі пра тое, як павялічыць прыбытковасьць такіх галінаў, як сельская гаспадарка, турызм, прадпрымальніцтва”.

Сваё бачанне сучаснага стану  і далейшых перспектыў Шклоўскага рэгіёну выклаў і кандыдат эканамічных навук, дацэнт Магілёўскага Дзяржаўнага Універсітэта Харчавання Пётр Мігурскі. Ён адзначыў, што ідэальны варыянт развіцця рэгіёна – нарошчванне вытворчага патэнцыялу да ўзроўня поўнай занятасці эканамічна актыўнага насельніцтва. Таксама ён засцярог увагу прысутных на праблемных момантах, якія ў бліжэйшы час закрануць эканоміку Шклоўшчыны.

Нагадаем нашым чытачам, што Рыгор Кастусёў нарадзіўся ў вёсцы Цяхцін Бялыніцкага раёна. Скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію па спецыяльнасці інжынер-механік, пасля заканчэння якой працаваў спачатку ў саўгасе “Друць”, а потым узначаліў саўгас “Іскра” Бялыніцкага раёна. Пасля пераезду на сталае жыхарства ў Шклоўскі раён працаваў там у камунальнай гаспадарцы, працяглы час яе ўзначальваў. З 1989 года актыўны ўдзельнік дэмакратычных працэсаў у краіне. У 1987, 1991, 1995 гадах абіраўся дэпутатам мясцовых Саветаў, у 2004 годзе балатаваўся ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў ад Бялыніцкага і Шклоўскага раёнаў. З 2002 года ўзначальвае Магілёўскую абласную арганізацыю БНФ “Адраджэнне”.

На прэзентацыю кнігі Рыгора Кастусёва і Пятра Мігурскага ў Шклоў былі запрошаны і рад прадстаўнікоў Бялыніцкага раёна, якія прынялі актыўны ўдзел у яе абмеркаванні.

***Барыс Вырвіч***

## Гісторыя нашых вёсак: Бахані

Вёска знаходзіцца на беразе рачулкі Малуша, альбо Малыш, па прыберагах якой толькі на тэрыторыі Запольскага сельсавета знаходзіцца каля 10 курганных груп эпохі Старажытнай Русі. Тактя курганы былі непасрэдна іля саміх Баханяў.

Час заснавання паселішча не вызначаны.

У 1909 – 1910 гадах многія беззямельныя баханьцы выехалі ў Сібір. Перад рэвалюцыяй у вёсцы жыло толькі некалькі сем’яў з роду Царанкоў. Дажывалі тут свой век і дзве апальныя пасля задушэння паўстання К. Каліноўскага шляхцянкі. Зрэдзьчасу сюды наязжаў і ўладальнік паселішча Логвінаў, які жыў у Варшаве і працаваў там суддзёй.

Пасля рэвалюцыі ў Бахані пачалі з’язжацца сем’і, якія жылі ў вярхоўі Малушы. Гэта былі небагатыя людзі і таму пад час калектывізацыі было раскулачана 3 ці 4 сям’і.

Калгас узнік у 1932 годзе. Яго назвалі “Сталінскі заклік”. Узначаліў калектыў з 10 сем’яў Мікола Мяцельскі.

У час вайны ў Баханях размяшчаўся штаб аднаго з батальёнаў Грышынскага атрада.

***Наталля Прышчэпава***

## У Магілёве нарадзіўся 370-тысячны жыхар горада

У Магілёве нарадзіўся 370-тысячны жыхар горада. Пра гэта паведамілі ў гарвыканкаме. Бацькі дзяўчынкі назвалі дачку Веранікай. Гэта ўжо другое дзіця ў сям’і. Першаму сыну 12 гадоў.

Згодна з рашэннем гарвыканкаму бацькі атрымаюць прэмію ў памеры 1000 базавых велічынь (31 мільён рублёў). Акрамя таго, ад удзельнікаў міжнароднага фэсту «Свет мёду і здароўя», які праходзіць у гэтыя дні ў Магілёве, ім падораць 100-кілаграмовую бочку мёда.

# Стабильность белорусского рубля в его стабильном падении

Тот факт, что белорусский рубль, несмотря на оптимистические заявления Петра Прокоповича, продолжает падать по отношению к другим валютам, в Нацбанке считают естественным процессом. Между тем независимые экономисты убеждены, что рубль обесценивается даже больше, чем констатирует официальная статистика.

О незыблемости белорусского рубля на днях вновь заговорил Петр Прокопович, агитируя население хранить деньги в национальной валюте: мол, и доходность по ней самая большая, и вообще «это сейчас самая устойчивая валюта в Беларуси». В подтверждение этого тезиса глава Нацбанка сослался на то, что курс белорусского рубля по отношению к доллару США остается практически неизменным в течение трех последних лет.

**Однако «Салідарнасць» подсчитала, что только за последний год белорусский рубль упал, причем по отношению ко всем 26 валютам, котировки которых публикует белорусский Нацбанк. К некоторым валютам — аж на 20%.**

— Да не может быть, что так намного, — удивились приведенным нами цифрам в Нацбанке. — В любом случае все происходит в рамках прогнозных показателей. А падение к доллару у нас даже ниже, чем мы прогнозировали. До конца года и в следующем году рубль будет стабилен по отношению к доллару.

— Но ведь и сам доллар существенно упал. Выходит, что стабильность белорусского рубля в его стабильном падении?

— Да, он стабильно будет падать. Мы же должны поддерживать своих экспортеров. И свою национальную валюту тоже должны поддерживать. Это естественно. А евро мы не регулируем.

Между тем независимые эксперты отмечают, что белорусский рубль обесценился даже больше, нежели гласит официальная статистика.

— Если считать номинально, то официально белорусский рубль потерял свою покупательскую способность на 8%. Именно столько, по официальным данным, составляет инфляция, — пояснил «Салідарнасці» экономист Леонид Злотников. — Рубль обесценивается, и это уже все на себе почувствовали. И реально он обесценивается еще больше, чем это утверждает официальная статистика.

***Анастасия Зеленкова***

# Беспрацоўных амаль няма?

Па стану на 1 кастрычніка на ўліку ў раёне стаяць 125 беспрацоўных, сярод якіх 86 жанчын і 41 малады чалавек ва ўзросце да 30 гадоў.

Дапамогу атрымліваюць 52 беспрацоўныя, 49 з іх пражываюць у сельскай мясцовасці.

У бягучым годзе прадугледжваецца стварэнне 180 новых рабочых месцаў за кошт розных крыніц фінансавання, у тым ліку 56 з іх з выкарыстаннем бюджэтнай пазыкі са сродкаў фонду сацыяльнай абароны насельніцтва.

Ужо працаўладкаваны 135 чалавек.

Чытаеш гэтыя статыстычныя лічбы і радуешся – беспрацоўных амаль няма. Потым выходзіш на вуліцу, пройдзеш крыху, паразмаўляеш з людзьмі і пачынаеш разумець зусім іншае...Адно не магу зразумець: навошта і каго мы дурым? Па любой буйной і не вельмі вёсцы ходзіць процьма людзей, якія нідзе не працуюць, бо нідзе ня могуць працаўладкавацца. Такая самая карціна і ў Бялынічах, дзе процьма людзей, каб неяк выжыць, да самага апошняга моманту езділа збіраць ягады і грыбы ў лес і на балота. Цырк ды і толькі, няўжо гэта сакрэт для нашых кіраўнікоў і статыстыкаў?

***Барыс Вырвіч***

# Анекдоты

Классный руководитель:
- Тема нашего родительского собрания: «Нищенская зарплата работников народного образования».

Толковый словарь:
Женщина – слабое, беззащитное существо, от которого невозможно спастись.

Самая лучшая игра – это хоккей. Треснеш кого-нибудь клюшкой по голове и получаешь за это всего две минуты.

Когда родилась демократия? Когда Бог подвел Адама к Еве и сказал:
- А теперь выбирай себе жену.

Тот, кто говорит, что видит женщин насквозь, очень многое теряет...

# Гісторыя раёна. Лістапад

- 1839. Ліквідацыя на Полацкім царкоўным саборы уніяцтва. У Бялынічах і навакольных вёсках налічвалася 17 уніяцкіх прыходаў з 20 тысячамі вернікаў.
- 1858, 13 лістапада. Бялынічы наведвае актыўны ўдзельнік нацыянальнага вызвольнага руху, пісьменнік Арцём Вярыга – Дарэўскі. У яго знакамітым “Альбоме...” Л. Гадлеўскі пакідае запіс: “Хай заўсёды з вамі будзе Бог”.
- 1872, 30 лістапада. Сакрэтны ліст обер – пракурора святога Сінода графу Д. А. Талстому, міністру народнай асветы, у якім выказваецца просьба аб перадачы Бялыніцкага касцёла і цудатворнага абразу не паводле архіўных дакументаў.
- 1906, 22 лістапада. Указ аб выхадзе сялян з абшчыны. Пачатак сталыпінскай аграрнай рэформы.
- 1914 (лістапад). У Бялынічах адкрылася багадзельня – “дом для призрения убогих”, разлічанае на ўтрыманне 20 чалавек.
- 1915, 22 лістапада. Праўленне Нежкаўскага крэдытнага таварыства звяртаецца ў Магілёўскую павятовую земскую управу аб аказанні частковай грашовай дапамогі на будаўніцтве ў вёсцы народнага дома.
- 1920, 5 лістапада. Пастановай Магілёўскага УГОРвыканкаму ствараецца Бялыніцкі валрэўкам.
- 1941 (лістапад). Утвараецца Вялікатрылесінская падпольная камсамольская група – кіраўнік І. А. Марозаў.
- 1947, 5 лістапада. Пабудавана гідраэлектрастанцыя на рацэ Аслік для патрэб сельгасарцелі “Ленінскі шлях” Машчаніцкага сельсавета.
- 1961 (лістапад). Пачаў дзейнічаць Бялыніцкі хлебазавод.
- 1976 (лістапад). Уводзіцца ў строй тыпавы будынак Эсьмонскай сярэдняй школы.
- 1999, 14 лістапада. Ствараецца бялыніцкі рок – гурт Ю. Несцярэнкі “Блюз Белай Ночы”.

# Деревня в опасности

Сельское хозяйство Беларуси - в опасности. Это невероятно. Но депутат ПП НС Мария Худая забила тревогу, сообщив, что следующий год станет пиковым для белорусского АПК, которому предстоит произвести огромные выплаты по кредитам и накопившимся долгам.

В 2008г. финансовое положение сельского хозяйства будет усугублено тем, что правительство намерено сократить объем помощи сельскому хозяйству до Br3,3 трлн. Наряду с этим аграрным предприятиям не разрешают самостоятельно повышать закупочные цены на сельхозпродукцию. «В итоге убытки АПК растут, зарплаты вдвое ниже, чем в промышленности, люди из села бегут. Если государство будет и дальше продолжать вести такую же политику, АПК просто разорится», - пришла к неутешительному выводу Мария Худая.

Однако депутату будет трудно разуверить горожан, уже давно и бесповоротно убежденных официальной пропагандой в том, что в Беларуси сельскому хозяйству оказывают беспрецедентную финансовую поддержку. Поэтому не исключено, что отдельные идеологически не подкованные граждане расценят слова депутата едва ли не как провокацию и черную неблагодарность за все хорошее, что сделал президент для возрождения отечественного АПК.

Только за девять месяцев в Беларуси на реализацию мероприятий госпрограммы возрождения и развития села направлено Br12,3 трлн., а долги можно списать - не в первый раз. Кредиты - рефинансировать, а закупочные цены вырастут вслед за розничными ценами. А «высокие цены на внешних рынках - это хороший ресурс для нашего сельского хозяйства», - заявил на днях Александр Лукашенко. Вот и разрешатся проблемы. И будущее у белорусских крестьян, проживающих в сборно-щитовых домиках со счетчиками воды и тепла, опять будет беззаботное и очень светлое.

***«БелГазета»***

## Анекдот дня

...А напоследок, дорогой Изя, сообщаю, что письмо, в котором ты просиш денег, мы не получали.

ПАХОДНЯ
ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

Грамадска-палітычная газета. Выдаецца на беларускай і рускай мовах, распаўсюджваецца бясплатна

Бялыніцкі раён, в. В.Машчаніца. тэл. 37-110. Рэдактар Вырвіч Б.І. Наклад. 299 асобнікаў